Free Belarus Center

# Ідэалогія “рускага свету” і беларуская грамадская думка

У якой ступені расійская і беларуская дзяржаўныя ідэалогіі вызначаюць грамадскую думку на Беларусі па пытаннях вайны і міру, замежнай палітыкі, адносінаў з суседзямі?

Павел Церашковіч

## Змест


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 2 |
| “Рускі свет” як ідэалогія | 2 |
| Галоўныя кампаненты ідэалогіі “рускага свету” | 3 |
| “Рускі свет” як мяккая сіла | 4 |
| “Рускі свет” на Беларусі | 5 |
| Знешнія пастаўшчыкі ідэалогіі “рускага свету” | 5 |
| Унутраныя пастаўшчыкі ідэалогіі “рускага свету” | 6 |
| Уздзеянне “рускага свету” на беларускі ідэалагічны пейзаж | 7 |
| Уздзеянне ідэалогіі “рускага свету” на беларускую грамадскую думку | 10 |
| Высновы | 12 |
| Рэкамендацыі | 13 |
| Literature | 14 |

## Уводзіны

“Рускі свет” – гэта агульнапрыняты тэрмін, каторы ў шырокім сэнсе азначае ідэалогію сучаснай рускай дзяржавы, а ў вузкім сэнсе – яе палітыку мяккай сілы. Ён адыгрывае велізарную ролю ў масавай палітычнай мабілізацыі дзеля падтрымкі палітыкі Крамля ў Расіі і ў замежжы. Рэжым Лукашэнкі стварае шырокія магчымасці для распаўсюджвання ідэалогіі “рускага свету” на Беларусі, надаючы амаль неабмежаваны доступ да нацыянальнай медыяльнай прасторы рускай прапагандзе ды сінхранізуючы наратывы прапагандыстаў у беларускіх СМІ з рускімі. Адначасова шэраг сацыялагічных даследаванняў паказвае, што беларуская грамадская думка застаецца іншай, чым у Расіі, уключна з ацэнкай “самых гарачых” пытанняў на сучаснай павестцы дня – руская інтэрвенцыя ва Ўкраіне ды ўдзел у ёй Беларусі.

Сінхранізацыя прапагандысцкіх наратываў сталася аб’ектам шэрагу даследчыцкіх прац і працэсаў маніторынгу [1]. Звычайна ў іх рабілася выснова аб тым, што беларуская афіцыйная прапаганда татальна падпарадкаваная рускай і сталася яе часткай. Адрозненні ў ідэалагічным кантэксце застаюцца па-за ўвагай. Але ж ідэалогія нашмат больш інертная, чым сучасная прапагандысцкая павестка дня. Больш таго, “лагер” афіцыйных беларускіх ідэолагаў не такі ўжо і маналітны, як магло б здавацца.

Мэта дадзенай аналітычнай працы – праверыць ступень уплыву ідэалогіі “рускага свету” на афіцыйны ідэалагічны дыскурс і беларускае грамадства, а таксама даць рэкамендацыі адносна паляпшэння супраціўлення ёй у будучыні.

## “Рускі свет” як ідэалогія

“Рускі свет” як шыльда да ідэалогіі выкарыстоўваецца паралельна тэрмінам ``рашызм”, “путынізм”, рускі нацыяналізм, рускі рэваншызм і г.д. Гэта асаблівы тып гібрыднай ідэалогіі, які не мае распаўсюджанага самаазначэння, сістэматычнага прадстаўлення пастулатаў альбо корпусу тэкстаў. Ён базуецца на ідэях еўразійства, геапалітыкі, рускага месіянства, шавінізму, аб’яднаных з практыкамі ксенафобіі (у прыватнасці, украінафобіі), інструменталізацыі гісторыі, культу Перамогі (у Другой сусветнай вайне).

Мэта “рускага свету” – усталяванне новага міжнароднага ладу, які б забяспечыў Расіі дамінуючае становішча ў свеце. Гэта ўключае перагляд межаў, дэмантаж міжнароднай архітэктуры бяспекі, паражэнне заходніх ліберальных дэмакратый, пабудову новай Імперыі на грунце нацыяналістычнай дыктатуры.

Нягледзячы на відавочную ўнутраную няпэўнасць і непаслядоўнасць, ідэалогія "рускага свету" дэманструе велізарную здольнасць да правакавання буйнамаштабнай сацыяльнай мабілізацыі, да масавай падтрымкі шэрагу вайсковых інтэрвенцый, (напоў)афіцынага анексавання тэрыторый незалежных дзяржаў. Яна распаўсюдзіла ўплыў прынамсі на частку рускамоўных супольнасцяў не толькі ў суседніх дзяржавах, але і па ўсяму свету.

## Галоўныя кампаненты ідэалогіі "рускага свету"

Еўразійства – гэта ідэалагічная канцэпцыя, якая прадстаўляе Расію ў якасці цывілізацыйнага суб'екту, заснаванага на ўнікальный сумесі еўрапейскай і азіяцкай культур. У адпаведнасці з ёй, Расіі непазбежна наканавана быць геапалітычна і культурна супрацьстаўленай Захаду ды знаходзіцца пад кіраўніцтвам аўтарытарнай ідэакратычнай эліты. Такія ідэі былі выпрацаваны расійскай інтэлектуальнай эміграцыяй у 20-я гады XX стагоддзя і набылі папулярнасць пасля развалу Савецкага Саюзу, галоўным чынам, дзякуючы спадчыне Льва Гумілёва, які спалучаў еўразійства са сваёй арыгінальнай тэорыяй этнасаў [2], і Аляксандра Дугіна, распрацаваўшага канцэпцыю таталітарнай еўразійскай імперыі ды ўсталявання новага сусветнага ладу [3]. Пасля анексіі Крыму і поўнамаштабнага ўварвання ва Ўкраіну ідэі еўразійства былі ўключаны ў галоўную плынь ідэалогіі Расіі, каб падкрэсліць рэзкі адыход ад арыентацыі на Захад.

Геапалітыка была адной з асноўных тэмаў публічнага дыскурсу ў нулявыя і дзесятыя гады бягучага стагоддзя. Геапалітычная канцэпцыя XIX ды першай паловы XX стагоддзяў была выцягнута з нябыту і папулярызавана, галоўным чынам, дзякуючы высілкам Дугіна. За 20 гадоў разам з перадрукам некаторых класічных тэкстаў XIX і XX стагоддзяў было выдадзена больш за 40 арыгінальных падручнікаў па геапалітыцы. Уяўляючы сабой свайго роду бескампрамісную форму геаграфічнага дэтэрмінізму, геапалітыка выкарыстоўвалася дзеля легітымізацыі аўтарытарызму як адзіна магчымай формы палітычнай улады у Расіі. Геапалітычная рыторыка выкарыстоўвалася і ў апраўданне ўжыцця вайсковай сілы ў міжнародных адносінах, у прыватнасці, супраць Украіны, якая лічыцца галоўнай прасторай для захавання Расіі як звышдзяржавы.

Культ Перамогі – гэта адна з істотных частак ідэалогіі "рускага свету", звязанай са святкаваннем перамогі ў Другой сусветнай вайне. Яна ўключае шэраг арганізаваных дзяржавай і спантанных маніфестацый, уключна з вайсковымі парадамі, масавымі мерапрыемствамі (накшталт "неўміручага палку "), уганараваннем ваенных помнікаў, прадстаўленнямі, тэлевізійнымі серыяламі, праслаўленнем зброі (аўтамат Калашнікава) і г.д. Культ Перамогі

выяўляецца гэтаксама за пасярэдніцтвам сумесі афіцыёзных ваенных наратываў ды рыторыкі Праваслаўнай царквы. У дзесятых гадах XXI стагоддзя ён ператварыўся ў серцавіну дзяржпрапаганды. Будучы свайго роду масавым насланнём, ён у значнай ступені прычыніўся да легітымізацыі агрэсіі супраць Украіны ў якасці працягу Другой сусветнай вайны.

Асаблівае месца ў ідэалогіі "рускага свету" займае інструменталізацыя гісторыі, у прыватнасці, з дапамогай паняцця "трыадзіны" рускі народ. У крайняй форме яно адмаўляе існаванне ўкраінскай нацыі (і па ўмаўчанні беларускай) і перадае ідэю дэнацыфікацыі Ўкраіны, адной з двух мэтаў рускай агрэсіі супраць Украіны, заяўленых У. Пуціным [4]. Тэрмін "дэнацыфікацыя Ўкраіны" пачаў актыўна выкарыстоўвацца ў другой палове дзесятых гадоў XXI стагоддзя, атрымаўшы найбольш поўную інтэрпрэтацыю ў публікацыях палітолага Т. Сяргейцава [5].

## "Рускі свет" як мяккая сіла

"Рускі свет" як мяккая сіла – гэта інструмент знешняй палітыкі, звязаны з рускім і рускамоўным насельніцтвам па-за межамі Расіі.

Сам тэрмін "рускі свет" як сеткавая структура рускамоўных супольнасцяў быў уведзены ў абарачэнне філосафам Пятром Шчадравіцкім у 90-я гады XX стагоддзя [6]. У 2007 годзе вядучы рускі этнолаг Валеры Цішкоў распрацаваў поўнамаштабную канцэпцыю "рускага свету" [7]. Ён лічыць, што рускі ўрад павінен ўмешвацца ва ўнутраныя справы дзяржаваў з вялікай прапорцыяй рускамоўнага насельніцтва, змушаючы іх да федэралізацыі альбо ўвядзення рускай мовы як другой афіцыйнай. З таго часу "рускі свет" інкарпараваны ў афіцыйны дыскурс замежнай палітыкі Расіі. Паняцце "рускага свету" было таксама прынята Маскоўскім Патрыярхатам дзеля абазначэння прасторы сваіх вернікаў [8].

"Рассупрацоўніцтва» (Федэральнае агенцтва па справах Садружнасці незалежных дзяржаваў, суайчыннікаў, якія жывуць у замежжы, і міжнароднаму гуманітарнаму супрацоўніцтву) – гэта асноўная афіцыйная ўстанова, скіраваная на прасоўванне палітыкі "рускага свету". Яно было заснавана ў 2008 годзе пасля нападу Расіі на Грузію, атрымаўшы ў спадчыну сетку офісаў, збудаваных у савецкую эпоху. Працуе прыкладна ў 80 краінах, налічвае да 900 супрацоўнікаў (2021 г.). Гадавы бюджэт складае каля 55 мільёнаў еўра (2020 г.) [9].

Фонд рускага свету – гэта асноўная афіцыйная ўстанова, скіраваная на прасоўванне палітыкі "рускага свету". Заснаваны ў 2007 годзе з мэтаю

пашырэння рускай культуры і мовы ды фармавання “рускага свету” як глабальнага праекту. Гадавы бюджэт складае каля 100-130 мільёнаў долараў (2015-2016 гг.). Фонд праяўляе актыўнасць ў традыцыйных СМІ і ў сацыяльных сетках. Ацэначна агульная аўдыторыя налічвае да 1,6 мільёнаў карыстальнікаў са 190 краінаў. Фонд працуе таксама праз сетку са 104 цэнтраў і 128 кабінетаў у 57 краінах, прызначаных для бібліятэк і НДА. Існуе і сетка амаль з 3 000 сяброўскіх арганізацый (2022 г.) [10].

Інструменталізацыя рыторыкі “рускага свету” была выкарыстана дзела апраўдання анексавання Крыму ў 2014 годзе і поўнамаштабнай агрэсіі Расіі супраць Украіны ў 2022-2023 гг.

## “Рускі свет” на Беларусі

“Рускі свет” на Беларусі – гэта паняцце, каторае звычайна ўжываецца для азначэння актыўных прыхільнікаў рускага нацыяналізму і неаімперыялізму. Прыхільнікаў “рускага свету” можна знайсці паўсюдна, таксама сярод найвышэйшых дзяржаўных службоўцаў, асабліва вайсковага і міліцэйскага камандавання. У шырэйшым сэнсе, тэрмін “рускі свет” можна ўжываць у дачыненні да тых, хто арыентуецца на Расію, абыякава альбо агрэсіўна ставячыся да каштоўнасцяў беларускай культуры.

## Знешнія пастаўшчыкі ідэалогіі “рускага свету”

У апошнія гады дзейнасць устаноў мяккай сілы “рускага свету” набыла на Беларусі беспрэцэдэнтныя маштабы. “Рассупрацоўніцтва” мае на Беларусі чатыры філіялы (у Мінску, Брэсце, Гомелі, Гародні). Дадатковы цэнтр з няясным статусам быў адчынены ў Магілёве [11]. Гэта больш, чым у любой іншай краіне, дзе яно працуе (звычайна колькасць філіялаў не перавышае двух). На Беларусі “Рассупрацоўніцтва” накіроўвае ўвагу на прадастаўленне стыпендый для вучобы у расійскіх універсітэтах, якія пакрываюць поўны курс навучання на ўзроўні бакалаўрыяту. З 2019 года колькасць стыпендый павялічылася ў 18 разоў і дасягнула 1300 у год [12].

Адной з асаблівасцяў дзейнасці “Рассупрацоўніцтва” з’яўляецца адсутнасць празрыстасці і публічнасці. Яго філіялы на Беларусі не маюць агульнадаступных вэбсайтаў, працуючы, галоўным чынам, у сацыяльных сетках. Вядома, што ценявая дзейнасць “Рассупрацоўніцтва” мае небяспечную гісторыю. Яго філіялы адыгралі вялізную ролю ў анексіі Крыма, а таксама ў абвяшчэнні Данецкай і Луганскай Народных Рэспублік. Невыпадкова Цімафей Сяргейцаў, ідэолаг дэнацыфікацыі Ўкраіны, прапаноўваў

выкарыстанне філіялаў “Рассупрацоўніцтва” як будучай акупацыйнай адміністрацы [13]. Гэтакая ж самая роля можа ім адводзіцца і на Беларусі. Мінскі філіял “Рассупрацоўніцтва” выкарыстоўваецца ў якасці штаб-кватэры Арганізацыі расійскіх суайчыннікаў ў Рэспубліцы Беларусь, якая мае таксічны антыбеларускі вэбсайт [14]. Аддзяленне Расійскага сацыяльнага ўніверсітэту ў Мінску таксама выкарыстоўваецца “Рассупрацоўніцтвам” у якасці платформы для распаўсюджвання прапаганды “рускага свету”.

У той час як дзейнасць Фонду рускага свету выглядае ўмеркаванай (ён мае адзін рускі цэнтр у Мінску і два кабінеты), Фонд падтрымкі публічнай дыпламатыі імя Гарчакова заслугоўвае асаблівай увагі. Ён адкрыў філіял у Мінску ў 2020 годзе і прадастаўляе шэраг стыпендыяльных праграм беларускім даследчыкам, што запаўняе пустку ў стыпендыях, узніклую пасля спынення заходнімі фондамі супрацоўніцтва з афіцыйнымі беларускімі ВНУ і НДІ.

## Унутраныя пастаўшчыкі ідэалогіі “рускага свету”

Маецца шмат асобаў ды ўстановаў, якія дэманструюць высокую актыўнасць пры падтрымцы ідэалогіі “рускага свету”. Сярод ВІП-асоб Наталлю Качанаву, Старшыню Савета Рэспублікі Беларусь, неабходна назваць у першую чаргу. Гэта ўплывовая асоба ініцыявала і правяла буйнамаштабную замену рэктараў універсітэтаў на прыхільнікаў ідэалогіі “рускага свету”. Яна вядомая таксама прымусовымператварэннем беларускамоўных школ у сельскай мясцовасці ў рускамоўныя.  Наталля Качанава непасрэдна ўдзельнічала ў ажыццяўленні рускіх праектаў мяккай сілы, напрыклад, Расійска-беларускай школы маладых лідэраў Саюзнай дзяржавы, арганізаванай Фондам падтрымкі публічнай дыпламатыі імя Гарчакова [15].

Безумоўна, колькасць прыхільнікаў “рускага свету” з’яўляецца высокай ва ўзброеных сілах, разведцы, міліцыі. Асабліва таксічную ролю адыгрывае ГУБАЗІК, беларуская палітычная паліцыя, якую часам называюць беларускім Гестапа. Ён “праславіўся” адкрытай варожасцю да беларускамоўных вязняў. Зміцер Дашкевіч, беларускі актывіст, арыштаваны ў красавіку 2022 года, быў моцна пабіты за тое, што размаўляў па-беларуску [16]. Ахвяры ГУБАЗІКа давалі сведчанні, што бачылі там на сценах партрэты Пуціна, рускія сцягі, сімвалы рускай агрэсіі.

Яшчэ адна сацыяльная група, асабліва актыўная ў прасоўванні ідэалогіі “рускага свету” – гэта  духавенства Рускай праваслаўнай царквы. Варта падкрэсліць ролю мінскага Святаелізавецінскага манастыра, які вядомы падтрымкай рускай інтэрвенцыі ва Ўкраіне і рускай вайсковай павесткі дня

ўвогуле. Манастыр рэалізуе праграму нефармальнай адукацыі на падставе гістарычнага наратыву "рускага свету" і вайсковай падрыхтоўкі. Адукацыйны цэнтр манастыра, альбо "Каўчэг", выкарыстоўваецца для сходаў Прэзідыуму Вышэйшай палаты беларускага Парламенту. На апошнім такім сходзе ў сакавіку 2024 года пад старшынствам Наталлі Качанавай гучалі прамовы прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства ўперамешку з прамовамі вышэйшых службоўцаў з Міністэрстваў культуры, інфармацыі, адукацыі, унутраных спраў [17]. Фармальна такія сустрэчы прысвечаны так званым "дзяржаўна-царкоўным сацыяльным партнёрствам", аднак фактычна дэманструюць, што менавіта Руская праваслаўная царква як інстытут сталася зборным пунктам ідэалогіі "рускага свету" на Беларусі.

## Уздзеянне "рускага свету" на беларускі ідэалагічны пейзаж

Паняцце еўразійства, ключавога кампаненту "рускага свету", не папулярна на Беларусі і нават шырока не вядома. Яго галоўны прыхільнік – Аляксей Дзермант (самазваны "беларускі Дугін"), аўтар кнігі "Беларусь – Еўразія. Памежжа Расіі і Еўропы" [18]. У кнізе прадстаўлена "лёгкая" версія неаеўразійства ў параўнанні з тэкстамі Аляксандра Дугіна, ад каторага яна несумненна чэрпае натхненне. У адрозненне ад Дугіна Дзермант аддае перавагу мяккай дэфініцыі будучай Еўразійскай імперыі, бліжэйшай да апісання Еўрапейскага саюзу. Ён так і не даў выразнай фармулёўкі зместу "еўразійскіх каштоўнасцяў", якія часам ужываюцца ў прапагандысцкім дыскурсе [19]. Адначасова ён прадастаўляў абшэрную аргументацыю на карысць акупацыі і дэнацыфікацыі Украіны перад шырокамаштабным рускім нашэсцем.

Ідэя Дзерманта наконт таго, што Беларусь не належыць да Еўропы, была паддадзена вострай крытыцы Ігарам Марзалюком, старшынём Камісіі па адукацыі беларускага Парламенту, каторы адзначыў: "Мы еўрапейцы, а ніякія не еўразійцы; ні рускія, ні ўкраінцы, ні беларусы. Гэта ўсё  трызненне " [20].

Афіцыйная эксклюзіўная сустрэча паміж Лукашэнкам і Дугіным (каторы ніколі афіцыйна не сустракаўся з Пуціным) у лістападзе 2022 года [21] не прынесла вялікіх зменаў у распаўсюдзе ідэяў еўразійства на Беларусі. На сённяшні дзень няма аніякіх прыкметаў, каб якія-небудзь кампаненты еўразійства былі ўвасрпрынятыя беларускім афіцыйным ідэалагічным дыскурсам. Больш таго, у адрозненне ад іншых прапагандыстаў Лукашэнкі галоўнаму апалагету еўразійства Аляксею Дзерманту не было прапанавана значнай ці хаця б сімвалічнай пасады ў сістэме ўлады.

Геапалітыка мае крыху шырэйшае ўздзеянне, дзякуючы ўключэнню ва ўніверсітэцкія навучальныя праграмы. Курс "Сучасная палітычная эканоміка" стаўся ў 2022 годзе абавязковым для ўсіх ВНУ на Беларусі. Ён мае асобны раздзел па геапалітыцы з абавязковымі матэрыяламі для чытання з "Асноваў геапалітыкі" [22], культавай публікацыі Аляксандра Дугіна. Існуе таксама цэлы шэраг універсітэцкіх падручнікаў па геапалітыцы. Некаторыя з іх паводле тэксту літаральна супадаюць з кнігай Дугіна [23]. Геапалітыка выкладаецца ў якасці асобнай універсітэцкай дысцыпліны, напрыклад, на Факультэце міжнародных адносінаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асобныя раздзелы па геапалітыцы ўключаны таксама ў падручнікі геаграфіі для сярэдніх школ [24]. Адначасова ступень папулярнасці геапалітыкі на Беларусі значна ніжэйшая, чым у Расіі, дзе яна з'яўляецца абавязковай дысцыплінай ва ўніверсітэцкіх навучальных праграмах по дзяржадміністрацыі.

У лагеры афіцыйных ідэолагаў (прынамсі ў яго частцы) існуе думка, што ідэалогія "рускага свету" не адпавядае традыцыйным каштоўнасцям і поглядам беларускага народу. Такая пазіцыя адлюстравана ў шэрагу публікацый Святланы Алейнікавай, загадчыцы аддзела сацыяльных даследаванняў Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў. У 2017 годзе яна апублікавала манаграфію па "рускаму свету" [25] і абараніла доктарскую дысертацыю ў 2023 годзе. Алейнікава, у прыватнасці, робіць выснову, што "у цэлым абыякавае стаўленне беларусаў да такіх ключавых рысаў "рускай ідэі", як месіянства, святасць, універсальны характар, не дазваляе нам гаварыць пра яе вялікую значнасць для сучаснага беларускага грамадства". Яна адзначае таксама, што "у шматлікіх працах па ідэалогіі беларускай дзяржавы адсутнічаюць непасрэдныя згадкі аб канцэпцыі "рускага свету" [26].

Варта адзначыць, што беларуская ідэалогія, як і руская, належыць да тыпу "размытых" канцэпцыяў, якія не дацягваюць да вялікій ідэалагічных наратываў XX стагоддзя. Краевугольны камень беларускай ідэалогіі – гістарычны наратыў, а "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", уключаная ва ўніверсітэцкія навучальныя праграмы ў якасці абавязковай дысцыпліны, займае такое ж самай месца, як "Гісторыя марсісцка-ленінскай Камуністычнай партыі" у Савецкім Саюзе [27].

Аналіз апошніх актуалізацый афіцыйнага гістарычнага наратыву, унесеных у 2023 годзе, пацверджвае высновы Алейнікавай. Гэта вынікае з рэзалюцыі семінара "Рэспубліка Беларусь: ад вытокаў да сучаснасці (гістарычны шлях будаўніцтва дзяржаўнасці)", праведзенага вышэйшымі дзяржслужачымі з Адміністрацыі Лукашэнкі, абедзвюх Палат Парламенту, Савету міністраў, ключавых міністэрстваў, Беларускай праваслаўнай царквы, дзяржаўнай палітычнай партыі "Белая Русь" [28]. І сапраўды, у тэксце можна знайсці ўсяго некалькі прыкметаў ідэалогіі "рускага свету". Напрыклад, сярод 12 значных дат,

прапанаваных для святкавання ў 2023 годзе, 1 адносіцца да агульнаславянскай гісторыі, 3 – да беларускіх падзеяй Другой сусветнай вайны, а астатнія – выключна да беларускай гісторыі.

Няма чаго дзівіцца, што вышэйшае рускае чынавенства і ўстановы пад рознымі зачэпкамі прабавалі ўмешвацца менавіта ў беларускі афіцыйны гістарычны наратыў.

У красавіку 2022 года Дзмітрый Мядзведзеў апублікаваў артыкул "Чаму непрадуктыўная любая камунікацыя з сучасным польскім кіраўніцтвам?" [29], у якім заявіў, што падзел Рэчыпаспалітай з рускага пункту гледжання падзелам не быў. Ён высоўвае аргумент, што Расія проста здабыла назад тое, што ёй належала на моцы гістарычнага права, і што "Беларусь вярнулася ў родную гавань". Мядзведзеў прапанаваў святкаваць 250-ыя ўгодкі гэтай падзеі, што не выклікала аніякага адказу з боку афіцыйнага Мінска.

Яшчэ адзін падобны выпадак – кампанія з ініцыятывы рускіх дзяржслужбоўцаў з мэтай падрыхтоўкі агульных падручнікаў па гісторыі на 2024 год, абвешчаная паслом Расіі Барысам Грызловым. Прадстаўнік беларускага боку, кіраўнік Адміністрацыі Лукашэнкі Ігар Сяргеенка, не ўзгадаў ўвогуле слова "падручнік", а вёў гаворку пра "супольнае вывучэнне гісторыі " [30].

У той самы час Віктар Садоўнічы, рэктар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэту, абвесціў, што сумесны ўніверсітэцкі падручнік "Гісторыя беларускіх земляў і беларуская дзяржава" ужо апублікаваны ды ўведзены ў адукацыйны працэс. Па факту аказалася, што гэта ўсяго 100 старонак "матэрыялаў для лекцыйнага курсу" з мінімальным удзелам беларускіх навукоўцаў, прычым якія адлюстроўваюць выключна рускі погляд на беларускую гісторыю [31]. Апошнія падзеі сведчаць, што афіцыйны Мінск аддае перавагу таму, каб моўчкі трымацца на адлегласці ад ідэалогіі "рускага свету" ды абмяжоўваць дзейнасць яго найбольш адыёзных прадстаўнікоў. Напрыклад, адкрыта прарускай актывістцы Вользе Бондаравай, вядомай шэрагам публічных даносаў, не было дазволена ў лютым 2024 года стаць дэпутатам Мінскага гарсавету. Яшчэ адна праруская актывістка, Эльвіра Мірсалімава, атрымала адміністрацыйны арышт і вялікі штраф [32]. Вядома, што падчас кампаніі па агульнай ліквідацыі структур грамадзянскай супольнасці ў 2020-23 гадах былі зачынены таксама некаторыя праруския арганізацыі. Афіцыйны Мінск да 2024 года не даваў дазволу на правядзенне акцый "неўміручага палку" як асобнага мерапрыемства, а гэтая падзея сталася адной са значных маніфестацыяў "рускага свету" у замежжы. У 2024 годзе яна была дазволена ў рамках правядзення афіцыйнага мерапрыемства "Беларусь памятае".

Адначасова, у цэлым, беларускі ідэалагічны дыскурс выглядае ўразлівым, таму што шэраг вызначэнняў няясныя альбо недастаткова выказаныя. Ведучы гаворку пра ўнікальную дзяржаўнасць, ідэолагі Лукашэнкі (і сам Лукашэнка) не даюць выразнага адказу, ці беларусы – гэта асобная нацыя альбо частка “трыадзінага” рускага народу. Ацэнкі ў беларускай гісторыі Расійскай імперыі і савецкага перыяду з’яўляюцца цалкам пазітыўнымі. Варта адзначыць, што тэрмін “паланізацыя” ужываецца неаднаразова, а тэрмін “русіфікацыя” адсутнічае цалкам. Перыяд Другой сусветнай вайны значна перабольшваецца як цэнтральная падзея ў беларускай гісторыі. Таму гэта не можа стацца сур’ёзным бар’ерам на шляху да далейшай экспансіі ідэалогіі “рускага свету” пад націскам сінхранізаванай руска-беларускай афіцыйнай прапаганды.

## Уздзеянне ідэалогіі “рускага свету” на беларускую грамадскую думку

Сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя шэрагам каманд незалежных сацыёлагаў (Беларуская аналітычная майстэрня, Беларуская ініцыятыва Інстытуту “Чатэм Хаўс”), паказваюць супярэчлівую карціну наконт уплыву ідэалогіі “рускага свету”  на беларускую грамадскую думку.

Апытанне аб геапалітычнай арыентацыі, праведзенае Беларускай аналітычнай майстэрняй у 2023 годзе [33], сведчыць аб наяўнасці трох вялікіх сацыяльных груп: праеўрапейцы (21%), прарускія і прасавецкія (31%), нявызначаныя (48%).

“Праеўрапейцы” маюць перакананыя пазіцыі адносна сацыяльна-палітычных падзеяў, цалкам сфармаваную нацыянальную ідэнтычнасць, моцную арыентацыю на заходнія краіны і еўрапейскія каштоўнасці, негатыўнае стаўленне да рэжыму Лукашэнкі, рускай агрэсіі супраць Украіны ды савецкага мінулага. “Праеўрапейцы” лепш адукаваныя, жыхары вялікіх гарадоў, сярэдняга ўзросту (37).

“Прарускія” таксама прытрымліваюцца перакананых сацыяльна-палітычных поглядаў, маюць перыферыйную імперскую ідэнтычнасць (кшталту “беларусы – гэта рускія з некаторымі асаблівасцямі”), пазітыўнае стаўленне да рэжыму Лукашэнкі, рускай агрэсіі супраць Украіны ды савецкага мінулага. У іх пераважна сярэдні ўзровень адукацыі, яны жыхары малых гарадоў і вёсак, належаць да старэйшага пакалення (51).

“Нявызначаныя” маюць хутчэй павярхоўнае разуменне сацыяльна-палітычнага жыцця, “размытую” ідэнтычнасць, пазбягаюць яснай пазіцыі да рэжыму, але ў большасці негатыўна ставяцца да рускай агрэсіі, хаця і нейтральна альбо пазітыўна – да савецкага мінулага. “Нявызначаныя” маюць

сярэднестатыстычныя характарыстыкі ўзроўню адукацыі, месца жыхарства і ўзросту (39).

Гэтае апытанне з шэрагам іншых дэманструюць, што канчатковая мэта ідэалогіі “рускага свету” у дачыненні да Беларусі, – яе ўключэнне ў склад расійскай дзяржавы, – не мае значнай колькасці прыхільнікаў нават сярод групы “прарускіх”; у агульным і цэлым, не больш за 4-5% ад усіх рэспандэнтаў.

Існуе таксама моцны кансенсус супраць непасрэднага ўдзелу Беларусі ў рускай інтэрвенцыі ва Ўкраіне: пераважная большасць рэспандэнтаў не падтрымлівае такой ідэі. Адначасова іх дзель у 2023 годзе ўпала ў параўнанні да 2022 года з 85% да 80,2% пад ціскам рускай ды афіцыйнай беларускай прапаганды. Пры гэтым дзель прагаласаваўшых за непасрэднае ўмяшальніцтва беларускай арміі ацэньваецца ў 11-2%%.

Сітуацыя з ацэнкай рускага ўварвання ва Ўкраіну істотна адрозніваецца [34]. Ёсць дзве амаль роўныя групы (да 29% у кожнай), якія падтрымліваюць Расію і якія аддаюць перавагу нейтральнай пазіцыі. А вось да 24% хутчэй падтрымала б Украіну.

Адсутнічае і аб’яднаная пазіцыя адносна таго, ці лічыць Захад ворагам (што тыпова для ідэалогіі “рускага свету”). Толькі “прарускія” падтрымліваюць такі погляд, тады як “праеўрапейцы” ды “нявызначаныя” ставяцца да гэтага адмоўна. Адносіны да Польшчы, найбуйнейшай суседняй заходняй краіны, даволі станоўчыя (“братэрская краіна”). Такі пункт гледжання падзяляюць “праеўрапейцы”, “нявызначаныя” і нават частка “прарускіх”. Гэты пункт гледжання застаецца стабільным, нават нягледзячы на актыўную антыпольскую прапаганду ў рускіх і афіцыйных беларускіх СМІ.

У адрозненне ад гэтага, на пытанне аб тым, хто з’яўляецца галоўнымі саюзнікамі Беларусі, групы “прарускіх” і “нявызначаных” даюць хутчэй супольны адказ, што гэта – Расія. Ідэю аб нейкай форме саюзу з Расіяй падтрымлівае 41-51%% рэспандэнтаў. Істотная колькасць рэспандэнтаў на пытанне аб меркаваных геапалітычных саюзніках адказвае, што адначасова аддае перавагу саюзу з Расіяй і ЕС (змена з 46% да 26% у 2023 годзе ў параўнанні да 2021 года).

Большасць рэспандэнтаў мае станоўчае стаўленне да Вялікага Княства Літоўскага. Усяго толькі частка “прарускіх” прытрымліваецца супрацьлеглай думкі. Адначасова толькі частка “праеўрапейцаў” лічыць савецкі перыяд поўнасцю негатыўным, аднак большасць ацэньвае яго хутчэй пазітыўна. Няма адзінага погляду і адносна стаўлення да такіх ключавых асобаў Расіі, як Пётр Вялікі ці Кацярына ІІ. “Праеўрапейцы” настроеныя адмоўна, “прарускія”

становуча, а “нявызначаныя” альбо не маюць пэўнай думкі, альбо ацэньваюць іх пазітыўна.

Адсутнічае і адзінства поглядаў адносна таго, калі ўзнікла беларуская дзяржаўнасць. “Прарускія” з істотнай часткай “нявызначаных” лічаць, што толькі ў савецкі перыяд. “Праеўрапейцы” думаюць, што Беларусь мае нашмат даўжэйшы перыяд дзяржаўнасці. Парадаксальна, што ў гэтым выпадку іх пазіцыя супадае з афіцыйным ідэалагічным дыскурсам, паводле якога вытокі беларускай дзяржаўнасці адносяцца да X стагоддзя. Нават праруская Наталля Качанава на адкрыцці вышэй памянёнага семінару па гісторыі ў 2023 годзе, канстатавала, што “першая (беларуская) дзяржава – гэта Полацкае княства. Гэта ... калыска беларускай дзяржаўнасці. Полацк быў адным з трох галоўных цэнтраў Старажытнай Русі разам з Ноўгарадам і Кіевам, заўсёды адрозніваючыся незалежнасцю. Таму ніхто не мае права папракаць нас, беларусаў, за тое, што мы нібыта не маем права да ўласнай незалежнай суверэннай дзяржавы” [35].

Крытычным пунктам нацыянальнай самаідэнтыфікацыі з’яўляецца ацэнка асноўнага паняцця “рускага свету” пра так званы «трыадзіны» рускі народ. Толькі “праеўрапейцы” не пагаджаюцца з такі паняццем, тады як “нявызначаныя” хутчэй пагаджаюцца ці не маюць на тэму пэўнага погляду. Падобная сітуацыя існуе і з ацэнкай адрозненняў паміж беларускай і рускай культурамі. “Прарускія” і “нявызначаныя” не бачаць значных адрозненняў, а вось “праеўрапейцы” лічаць, што беларуская культура бліжэйшая да культураў еўрапейскіх народаў.

## Высновы

“Рускі свет” – гэта агрэсіўная ідэалогія, скіраваная на ўсталяванне новага міжнароднага парадку, які б забяспечыў Расіі дамінуючыя пазіцыі ў свеце. Як ідэалогія “рускага свету”, так і афіцыйная беларуская ідэалогія належаць да гэтак званых “размытых” канцэпцыяў, якія значна адрозніваюцца ад класічных аўтарытарных ідэалогіяў XX стагоддзя.

“Рускі свет” на Беларусі мае ўсё большую інфраструктуру ўстановаў “мяккай сілы”. Існуе таксама ўнутраная сетка прыхільнікаў “рускага свету”, уключна з найвышэйшымі дзяржаўнымі службоўцамі, афіцэрамі разведкі і міліцыі, духавенствам Рускай праваслаўнай царквы.

Нягледзячы на сінхранізацыю рускага і беларускага афіцыйных прапагандысцкіх наратываў, беларускі ідэалагічны дыскурс застаецца аддаленым ад “рускага свету”. Адначасова ў сувязі са сваёй прыродай

афіцыйны беларускі дыскурс уразлівы на ціск з боку “рускага свету”. Паводле вынікаў сацыялагічных даследаванняў, большасць беларусаў не падтрымлівае задач ідэалогіі “рускага свету”, уключна з магчымым анексаваннем Беларусі, і рускай ітэрвенцыяй ва Ўкраіне. Адначасова істотная частка беларусаў не мае поўнасцю сфармаванай нацыянальнай ідэнтычнасці, падзяляючы некаторыя паняцці “рускага свету”, як прыналежнасць да “трыадзінага” рускага народу.

Толькі моцная нацыянальная ідэнтычнасць можа захаваць перад уплывам ідэалогіі “рускага свету’’. Група “нявызначаных” з’яўляецца асноўнай мэтавай аўдыторыяй дзеля супрацьдзеяння ідэалогіі “рускага свету”.

## Рэкамендацыі

**Асобам, адказным за прыняцце важных рашэнняў:**

- аказанне падтрымкі ў правядзенні ацэнкі патрэбаў ды распрацоўцы комплекснай стратэгіі па супрацьдзеянні ідэалогіі “рускага свету” на Беларусі.

**Экспертам, даследчыкам, фабрыкам думкі:**

- усталяванне кааліцыі НДА, уключна з фабрыкамі думкі і медыяльнымі групамі, дзеля кіравання стратэгіяй супрацьдзеяння “рускаму свету”;
- зрух фокусу аналізу беларускай сітуацыі з адносінаў паміж Расіяй і Захадам у бок пазіцыі Беларусі ў рэгіёне Ўсходняй Еўропы ды падкрэсліванне яе культурна-гістарычных і іншых сувязяў з Украінай, краінамі Балтыі, Польшчай;
- вызначэнне тэмаў (у тым ліку з афіцыйнага ідэалагічнага дыскурсу), якія цешацца высокай ступенню станоўчага стаўлення ў грамадстве і могуць стымуляваць уздым пазітыўнай самаідэнтыфікацыі (гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, мадэрнізацыя 1960-80-х гадоў і г.д.)

**Сродкам масавай інфармацыі:**

- прапанаванне большай колькасці публікацыяў аб дыструкцыйнай ролі, якую адыгрываюць такія ўстановы “рускага свету”, як філіялы «Рассупрацоўніцтва», Фонд імя Гарчакова, мінскі Святаелізавецінскі манастыр і г.д.;
- павелічэнне колькасці публікацыяў аб такіх супярэчлівых, але ж беларускіх вядомых палітычных дзеячах, як Кірыла Мазураў ці Пётр Машэраў, што магло б зменшыць уплыў як “герояў” “рускага свету”, так і асобы самога

Лукашэнкі;

- прапанаванне большай колькасці публікацыяў аб літоўцах, латышах, украінцах ды іх адносінах з беларусамі, каб умацаваць пачуццё прыналежнасці да Ўсходняй Еўропы.

# Літаратура


1. For example: Призывы к геноциду в отношении украинцев в российской и беларусской пропаганде — iSANS, https://mediaiq.info/belorusskij-silovik-lepit-iz-ukrainy-agressora-analiz-kontenta-v-belarusskom-telegram-za-pervyj-kvartal-2024-goda-po-tematike-vojny-v-ukraine
2. Гумилёв Л.Н. Этногенез и биосфера Земли. Л.: Изд-во Ленинградского университета, 1989.
3. Дугин А.Г. Основы геополитики: геополитическое будущее России. М.: Арктогея, 1997.
4. Обращение Президента Российской Федерации 24.02.2022. Обращение Президента Российской Федерации
5. Сергейцев Т. Что Россия должна сделать с Украиной? РИА Новости. 03.04.2022. https://ria.ru/20220403/ukraina-1781469605.html
6. Щедровицкий П. Русский мир и транснациональное русское.  Библиотека культурной политики, управления и предпринимательства. АТШ, 1999.
7. Tishkov, Valery. Russian world – changing meaning and strategies. Carnegie papers, 2008.
8. Святейший Патриарх Кирилл: Русский мир — особая цивилизация, которую необходимо сберечь
9. Koval, Nadiia, Irysova, Maryna, Tutiuk, Serhiy, Tereshchenko, Denis. Rossotrdnichestvo: the unbearable harshness of soft power. Ukrainian Institute, 2022.
10. Masiyenko, Yulia, Zahryvenko, Katerina, Koval, Nadiia, Tereshchenko, Denis. The Russian flag will be flown wherever Russian is spoken. “Russkiy Mir” Foundation. Ukrainian Institute, 2022.
11. Русский информационно-культурный центр открылся в Могилеве - 08.12.2023, Sputnik Беларусь
12. Макушин: какое образование белорусы по квотам смогут получить в ВУЗах РФ. Спутник. 26.12.2023. https://sputnik.by/20231226/makushin-kakoe-obrazovanie-belorusy-mogut-poluchit-po-kvotam-v-vuzakh-rf-1082354248.htm
13. Сергейцев Т. Что Россия должна сделать с Украиной? РИА Новости. 03.04.2022. https://ria.ru/20220403/ukraina-1781469605.html
14. Сайт общественных организаций российских соотечественников в Республике Беларусь. https://ross-bel.ru/
15. Студенты: школа молодых лидеров Союзного государства может помочь интеграции. Спутник. 26.05.2023. https://sputnik.by/20230526/studenty-shkola-molodykh-liderov-soyuznogo-gosudarstva-mozhet-pomoch-integratsii-1075952845.htm
16. Змитер Дашкевич в заключительном слове: Губопаўцы смяяліся: «Жонка будзе нараджаць у турме» — REFORM.by
17. В центре «Ковчег» состоялось выездное заседание Президиума Совета

Республики Национального собрания Республики Беларусь на тему «Общественно-государственное партнерство в сохранении духовно-нравственных ценностей современного общества»
18. Дзермант А. Беларусь – Евразия. Пограничье России и Европы. М., Родина, 2022.
19. Декан ФМО БГУ: наступило время для четкого посыла миру - суверенитет Беларуси будет обеспечен всеми средствами. Беларусь сегодня. 04.04.2023. https://www.sb.by/articles/dekan-fmo-bgu-nastupilo-vremya-dlya-chetkogo-posyla-miru-suverenitet-belarusi-budet-obespechen-vsemi.htm
20. Марзалюк: Мы еўрапейцы. Еўразійства — гэта трызненне.
21. Встреча с российским философом и общественным деятелем Александром Дугиным | Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь
22. Типовая учебная программа по дисциплине “Современная политэкономия”
23. Геополитика: учеб.-метод. пособие / Л. М. Гайдукевич [и др.]. Мн., БГУ, 2011.
24. Анціпава К.А., Гузава В.М. Геаграфія. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету. Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2020.
25. Алейникова С. М. «Русский мир»: белорусский взгляд. Минск: РИВШ, 2017.
26. Алейникова С. М. «Русский мир»... с..134, 142.
27. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022.
28. Эксперты обсудили исторический путь государственного строительства
29. Почему непродуктивно любое общение с нынешним польским руководством | 31.03.2022, ИноСМИ
30. Сергеенко: Беларусь и РФ сделали еще один шаг для защиты исторической памяти
31. История белорусских земель и белорусского государства. Краткий очерк. Материалы к лекционному курсу. Учебное пособие для вузов: учебное пособие / Под ред. В.В.Даниловича, О.В.Солоповой. – СПб.: Алетейя, 2023. – 102 с.
32. Силовики продолжают “кошмарить” сторонницу “русского мира”. euroradio.fm.30.03.2024. https://euhttps://euroradio.fm/ru/prorossiyskuyu-aktivistku-mirsalimovu-nakazali-krupnym-shtrafomroradio.fm/ru/prorossiyskuyu-aktivistku-mirsalimovu-nakazali-krupnym-shtrafom
33. Многофакторная структура белорусского обўества. https://www.bawlab.eu/BAW_Social_Structure.html
34. Індыкатары. https://belaruspolls.org/indicators
35. Вступительное слово Председателя Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Кочановой Н.И. на выездном семинаре Совета Республики на тему «Республика Беларусь: от истоков до современности (исторический путь государственного строительства)

Праект рэалізуецца Free Belurus Center.
Каардынатарка праекта Роза Турарбекава.